Занятасць насельніцтва

Пытанне: якім чынам можна атрымліваць інфармацыю аб актуальных вакансіях па ўсіх рэгіёнах Рэспублікі Беларусь?
Адказ: з актуальнымі вакансіямі, якія заяўляюцца наймальнікамі ў органы па працы, занятасці і сацыяльна абароне, як Лельчыцкага раёна, так і па іншых рэгіёнах Рэспублікі Беларусь можна азнаёміцца на Партале дзяржаўнай службы занятасці па адрасе: http://gsz.gov.by.

Пытанне: ці можа быць зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага грамадзянін, які ажыццяўляе догляд дзіцяці ва ўзросце да 3-х гадоў?
Адказ: грамадзяне, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці да 3 гадоў, згодна з артыкулам 2 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь" лічацца занятымі і згодна з абзацам першым часткі трэцяй артыкула 3 гэтага Закона не могуць быць зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага.